НЯХАЙ ЖЫВЕ 58-Я ГАДАВІНА ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ВЯЛІКІ КАСТРЫЧНІК, ЯКІ АДКРЫЎ НОВУЮ ЭПОХУ СУСВЕТНАЙ ГІСТОРЫІ—ЭПОХУ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА АБНАЎЛЕННЯ СВЕТУ, ПЕРАХОДУ АД КАПІТАЛІЗМУ ДА САЦЫЯЛІЗМУ!

(З Заклікаў ЦК КПСС да 58-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 31 (2005) ● Чацвер, 6 лістапада 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

ДАРОГАЙ ПЕРАМОГ

У 58-ы раз святкуюць савецкія людзі гадавіну Вялікага Кастрычніка. Дзень нараджэння першай у свеце сацыялістычнай краіны адзначаецца у абстаноўцы усенароднага уздыму. Пад сцягам Кастрычніка, пад кіраўніцтвам роднай Камуністычнай партыі наша краіна за 58 год прайшла шлях, роўны стагоддзям. Узняўшыся да вышынь развітога сацыялізму, савецкі народ цяпер упэўнена узводзіць велічны будынак камунізму.

У выніку перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі адбыліся карэнныя змены і у жыцці беларускага народа. Дзякуючы нястомным клопатам Камуністычнай партыі працоўныя Беларусі дабіліся небывалых поспехаў у эканамічным, палітычным і культурным жыцці.

Веліччу спрау і здзяйсненняў адзначаны магутны поступ Кастрычніка. Кожная яго гадавіка—гэта новая вяха у гісторыі нашай Радзімы. Сёння, урачыста святкуючы 58-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, мы з гонарам аглядваем пройдзены шлях, упэўнена глядзім у будучае.

Савецкія людзі азнаменавалі пяты, завяршальны год дзевятай пяцігодкі шырокім размахам сацыялістычнага спаборніцтва за паспяховае выкананне гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС.

Новыя павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы узялі на сябе працоўныя калектывы у гонар XXV з'езда КПСС.

Дастойны ўклад у агульнанародную справу будаўніцтва камунізму уносяць працоўныя нашай роднай Беларусі. У гэтыя дні наша рэспубліка вітае слауных рабочых, працаўнікоу палёу, вучоных.

У святочнае убранне апрануўся наш прыгажун Мінск. Заутра у святочных калонах выйдуць на плошчы горада студэнты вышэйшых навучальных устаноў і сярод іх студэнты буйнейшай ВНУ рэспублікі — Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Яны будуць рапартаваць партыі і народу аб сваіх поспехах у вучобе, аб выдатных выніках трэцяга, працоўнага семестра, аб дапамозе, якую яны аказалі працаўнікам вёскі ва уборцы ураджаю. Вучоныя універсітэта раскажуць аб дасягненнях у навуковай дзейнасці, аб новых вынаходніцтвах і адкрыццях.

Быццам памаладзеу у гэтыя дні наш універсітэцкі гарадок. Прыузняты, святочны настрой пануе у карпусах і інтэрнатах. На факультэтах праведзены шматлікія цікавыя мерапрыемствы, прысвечаныя слаунай гадавіне, паявіліся спецыяльныя выпускі насценгазет, арганізаваны выстаукі. Пятага лістапада адбыуся агульнаунівєрсітэцкі святочны вечар. У зале сабраліся старэйшыя выкладчыкі, аспіранты і студэнты, каб напярэдадні слаунага дня расказаць аб сваіх поспехах і дасягненнях.

Са святам вас, дарагія сябры! Новых поспехаў у працы, новых адкрыццяў і дасягненняў!

САЮЗ БАРАЦЬБЫ

ВОСЕННЮ 1895 года у Пецярбурзе адбылася гістарычная падзея. Дзейнічаушыя тут нелегальныя марксісцкія гурткі пад кіраўніцтвам У. І. Ленина аб'ядналіся у адзіную палітычную арганізацыю. У тым жа годзе, у снежні, гэта арганізацыя атрымала назву «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа».

За кароткі час заснаваны Ленiным «Саюз барацьбы» атрымау шырокую вядомасць і меу вялікі уплыў сярод піцерскіх рабочых. У 1895—1896 гадах «Саюз барацьбы» быу звязаны з рабочымі 70 прадпрыемстваў. Яго аутарытэт узрастау і сярод прагрэсіўнай інтэлігенцыі.

Спалучэнне тэорыі з надзённымі задачамі практычнай барацьбы было характэрнай асаблівасцю дзейнасці «Саюза барацьбы». Ён упершыню спалучыу навуковы сацыялізм з масавым рабочым рухам.

«Саюз барацьбы» прадстауляу сабой стройную цэнтралізаваную арганізацыю, якая складалася з кіруючага цэнтра, адыгрываушага ролю гарадскога камітэта, трох раённых груп, выконваючых абавязкі раённых камітэтаў, і 20—30 сацыял-дэмакратычных рабочых гурткоу. У аснову дзейнасці «Саюза» быу пакладзены цэнтралізм — важнейшы арганізацыйны прынцып рэвалюцыйнай пралетарскай партыі, распрацаваны Леніным.

У ноч на 9 снежня 1895 года паліцыя нанесла першы удар па «Саюзу». Былі арыштаваны У. І. Ленін, Г. М. Кржыжаноускі, В. В. Старкоу, А. А. Ванееу, а таксама член Маскоуска-Нарскай раённай групы «Саюза» П. К. Запарожац, В. А. Шалгуноу і некалькі іншых рабочых актывістаў. Але «Саюз» працягваў работу. 5 студзеня 1896 года адбыліся новыя арышты. А ў ноч на 12 жніуня 1896 года были арыштаваны амаль усе, хто застауся на свабодзе: Н. К. Крупская, М. А. Сільвін і іншыя. Усяго было арыштавана 128 чалавек.

Ленінскі «Саюз барацьбы» быу зародкам марксісцкай партыі. Вопыт яго дзейнасці дазволіу Леніну пасля сфармуляваць важнейшыя палажэнні аб партыі новага тыпу.

Па узору пецярбургскага «Саюза» сталі ствараццa саюзы і групы у Маскве. Туле, Іванава-Вазнясенску, Яраслаўлі, Растове-на-Доне і у іншых гарадах.

Па Н. НЯЛІДАВУ.

В. ШЫМУК

Гэтак шчыра
І гэтак прывычна
Сустракаем мы свята
Кастрычніка.

Сустракаем
Рупліваю працай:
Глянь — пад хмары
Узняліся палацы.

Глянь — агні,
Нібы зоркі, з вакон...
Глянь — рунеюць
Палі навакол.

Сустракаем
Сваё мы свята
Новым подзвігам
Касманаутау.

Новай фабрыкай
І заводам,
Новай песняй
Аб шчасці народным.

Наша свята
Ідзе па плошчах
І на ветры
Сцягі палошча.

У кожны дом
І у кожную хату
Завітала
Кастрычніка свята.

Крочыць свята
Па усёй планеце,
Сее прауду
Па белым свеце.

Праз вякі
І праз тысячагоддзі
Будзе к людзям
Кастрычнік прыходзіць.

З пакалення
У пакаленне
Паутараць будуць людзі:
— ЛЕНІН.

ШЭСЦЬ ОРДЭНАЎ НА ТВАІМ КАМСАМОЛЬСКІМ БІЛЕЦЕ

ПРАЦОЎНЫЯ БУДНІ

У ВЕРАСНІ 1953 года Пленум ЦК КПСС абмеркаваў пытанне «Аб мерах далейшага развіцця сельскай гаспадаркі у СССР». Камсамольскім арганізацыям была пастаулена задача — выступаць зачынальнікамі сацыялістычнага спаборніцтва, укаранення у вытворчасць перадавых метадаў працы, навейшых дасягненняу сельскагаспадарчай навукі і тэхнікі.

Саюз моладзі актыуна уключыуся у барацьбу за уздым сельскай гаспадаркі. За першыя паутара года на пастаянную работу у жывёлагадоулю было накіравана каля 200 тысяч камсамольцау. На работу у вёску вярнуліся амаль 10 тысяч маладых спецыялістау сельскай гаспадаркі і больш 16 тысяч механізатарау.

Адным з магчымых шляхоу павелічэння вытворчасці збожжа з'явілася асваенне цалінных і абложных зямель. Праграму асваення цалiны у Казахетане, Сібіры, на Урале, у Паволжы, на Пауночным Каўказе намецiу сакавіцкі Пленум ЦК партыі 1954 года. Неабходна было расшырыць пасевы збожжавых у 1954—1955 гадах за лік новых зямель не менш чым на 13 мільёнах гектарау.

Асваенне цалiны выллася ва усенародны патрыятычны рух. У ім прымалі удзел прадстаунікі усіх рэспублік, людзі розных пакаленняу. Але па праву цалiну называюць сённяшнім краем подзвігу савецкай моладзі.

Сярод першых, хто адгукнууся на заклік партыі, былі камсамольцы Маскоускага аутазавода імя Ліхачова. Прайшло усяго 3—4 дні, і ужо звыш 25 тысяч маладых масквічоу выказалі жаданне ехаць ва усходнія раёны краіны. І так было па усёй краіне.

22 лютага ад перона Казанскага вакзала сталіцы адбывау першы эшалон цалiннікаў. Ад'язджалі тыя, хто у гэты ж дзень у Вялікім Крамлёускім палацы, на сходзе добраахвотнікаў Масквы і вобласці, звярнууся да усёй моладзі краіны: «Станавіцеся у рады нашай новай працоунай раці! Едзьце на новыя землі!»

Затым былі дзесяткі, сотні камсамольска-маладзёжных эшалонау з Украіны, Беларусі, Прыбалтыкі і Закауказзя, з Іванава, Смаленска, Яраслаўля...

Усяго Саюз моладзі накіраваў на цалiну 350 тысяч добраахвотнікаў. Калі б спатрэбілася, выехала б значна больш...

«...Ведаем,— гаварылася у калектыунай заяве групы рабочых Горкаускага машынабудаунічага завода імя Вераб'ёва,— што першы час будзе цяжка, давядзецца жыць па-паходнаму, дождж і вецер не раз будуць выпрабоуваць нашу волю і загартаванасць. Але савецкай моладзі цяжкасці не страшныя. Мы абяцаем высока несці сцяг Ленінскага камсамола на перадавой лініі калгаснай вытворчасці».

Зараз не пазнаць месц, куды прыбылі па пуцёуках камсамола тыя ранбяты і дзяучаты. Добраупарадкаваныя пасёлкі, сады, транспартныя магістралі пераутварылі там усё навокал. А тады... Гісторыя многіх саугасау пачыналася з калочкау, убітых у прамёрзлую зямлю.

У кароткі тэрмін, за 3 гады, было створана 425 новых саугасау, асвоена амаль 36 мільёнау гектарау новых зямель. Засекі Радзімы папоуніліся сотнямі мільёнау пудоу хлеба.

На цалiне выраслі не толькі багатыя ураджаі. Тут выраслі, загартаваліся і тыя, хто паднімау яе. Для тысяч маладых людзей удзел у асваенні цалiнных і абложных зямель стау школай жыцця, мужнасці, камуністычнага выхавання.

Радзіма высока ацаніла працоуны подзвіг моладзі. За вялікія заслугі у сацыялістычным будаунiцтве і за самаадданую працу на асваенні цалiных і абложных зямель камсамол у 1956 годзе быу узнагароджаны ордэнам Леніна. Гэта пятая узнагарода Саюзу моладзі. Звыш 30 тысяч юнакоу і дзяучат былі узнагароджаны медалямі і ордэнамі, 262 чалавекі удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы. Каля 360 тысяч узнагароджаны значком ЦК ВЛКСМ «За асваенне новых зямель».

ЗНАЁМЦЕСЯ: ЭВАС

Здаецца, чыясьці нябачная рука дакранаецца да сьветла-зялёнага экраніка, на якім яркім аксамітам успыхваюць словы, загады. Лёгкімі дотыкамі пальцау да клавішау пульта пасылаюцца ў мозг разумнай машыны адказы на яе пытанні, рашэнні задач. Пакуль што за пультамі кіравання самі навуковыя супрацоунікі кафедры электронных матэматычных машын фізічнага факультэта, старшыя навуковыя супрацоунікі А. І. Тарнопальскі, А. В. Арлоу, А. М. Мухарскі і іншыя. Яшчэ і яшчэ раз правяраюць яны праграму, зададзеную машыне, уносяць папраукі, бо не усё бездакорна і гладка у нетрах бясстраснага розуму.

БДУ — ЭВАС-75... Нават на фізічным факультэце не кожны ведае, што гэта такое. Эксперыментальная вылічальная абучаючая сістэма — іменна так расшыфроўваецца назва новай сістэмы праграміраванага навучання. Гэта першая у СССР сістэма з экраннымі пультамі, або, як іх яшчэ называюць, дысплэямі.

Па-сапраўднаму ацаніць перавагу новай сістэмы навучання змогуць самі студэнты, якія ў хуткім часе стануць вывучаць мову праграміравання ФОРТРАН з дапамоган электронных матэматычных машын. Машына, аналізуючы адказы студэнта, вызначае узровень яго ведану і вядзе навучанне з улікам асаблівасцей засваення матэрыялу, інакш кажучы, яна рэгулюе паток інфармацыі для кожнага паасобку. А гэта у сваю чаргу павышае эфектыўнасць індывідуальнага навучання.

Рыхтуецца загад рэктара аб укараненні новай абучаючай сістэмы. І ужо у лістападзе засвецяцца усе 16 экранау класа—за пульты сядуць самі супрацоунікі кафедры, слухачы факультэта павышэння кваліфікацыі. Яны першымі пройдуць падрыхтоўку па новай сістэме вывучэння мовы праграміравання.

— У недалёкім будучым,— расказвае старшы навуковы супрацоунік кафедры электронных матэматычных машын А. М. Мухарскі,— мова праграміравання будзе вывучацца і на іншых факультэтах. А у перспектыве — нават абітурыенты змогуць здаваць уступныя экзамены вылічальным машынам. Магчымасці новай сістэмы навучання вельмі шырокія, з дапамогай яе можна вывучаць любы прадмет. Зацікауленасць саміх выкладчыкаў паслужыла б дапамогай у нашай справе.

Безумоўна, работы і у выкладчыкаў кафедры, і у студэнтаў шмат, далягляды прывабныя. Пажадаем ім поспеху у авалоданні і прапагандзе новай сістэмы. Гэта ж толькі пачатак шляху, таму скажам ім наша спагадлівае студэнцкае «ні пуху, ні пер'я».

Г. ЗУЙ,
студэнтка II курса журфака.
Фота **Т. Петрашкевіч.**

АДЗІНСТВА, НАРОДЖАНАЕ Ў БАЯХ

10 кастрычніка — 30 год з дня стварэння (1945) Сусветнай федэрацыі дэмакратычнай моладзі.

«...Мы сабраліся сюды, каб справамі пацвердзіць адзінства усёй моладзі. Салют нашым таварышам, якія загінулі у барацьбе. Дадзім наша слова, што ўмелыя рукі, востры розум, малады энтузіязм ніколі больш не будуць траціцца на вайну...»

Гэтыя словы прагучалі 29 кастрычніка 1945 года у Лондане на Сусветнай канферэнцыі моладзі.

Ідэя склікання Сусветнай канферэнцыі была выказана перадавымі прагрэсіўнымі маладзёжнымі арганізацыямі дзеля таго, каб стварыць міжнароднае аб'яднанне дэмакратычнай моладзі.

На Сусветнай канферэнцыі моладзі прысутнічала 437 дэлегатау і 148 аглядальнікаў, якія прадстаулялі каля 30 мільёнау чалавек з 63 краін.

СССР—краіна, якая ўнесла рашаючы ўклад у перамогу над гітлераускай Германіяй і імперыялістычнай Японіяй, — быў прадстаулены шматлікай дэлегацыяй.

Бура апладысментау, крыкі «ура» заглушаюць словы вяшчальніка:

Дэлегацыям моладзі рэспублік, раскінуушыхся ад полюса да тропікаў, моладзі краіны сацыялізму прывітанне!

На парадку дня—барацьба моладзі за свабоду і лепшы мір; пасляваенныя патрэбы моладзі; арганізацыя міжнароднага супрацоунiцтва моладзі.

Бурна абмяркоувалася трэцяе пытанне — аб стварэнні міжнароднай федэрацыі моладзі. Большасць дэлегатау выказвалася за тое, каб федэрацыя насіла дэмакратычны, антыфашысцкі характар. Канферэнцыя выбрала Савет міжнароднай федэрацыі дэмакратычнай моладзі, у які увайшлі 120 прадстаунікоў розных маладзёжных арганізацый.

Так была створана Сусветная федэрацыя дэмакратычнай моладзі.

Прайшло 30 год. Федэрацыя выраслa у 2,5 раза. Змяніліся формы і метады барацьбы. Але ідэі, пакладзеныя у яе аснову — барацьба за мір і дружбу паміж народамі,—будуць і далей прыцягваць пад сцягі СФДМ новыя атрады маладых барацьбітоў.

Па В. ЗВЕРАВУ.

СПРАВАЗДАЧА ДТСААФ

На савеце універсітэта падведзены вынікі работы арганізацыі ДТСААФ за мінулы навучальны год.

У дакладзе старшыні універсітэцкага камітэта ДТСААФ **М. В. Гарлатава**, у прыватнасці, гаворыцца: у 1974—1975 навучальным годзе арганізацыя ДТСААФ сумесна з камсамольскімі, прафсаюзнымі арганізацыямі, саветам ветэранау, таварыствам «Веды» пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый прарабіла значную работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню. Былі прыняты сацыялістычныя абавязацельствы на 1975 год, быу аб'яулены агляд-конкурс на лепшую арганізацыю абаронна-масавай работы на факультэтах і кафедрах універсітэта. На факультэтах были створаны аргкамітэты, у састау якіх увайшлі старшыні усіх грамадскіх арганізацыи.

Аргкамітэт універсітэта пастаянна цікавіуся работай арганізацый ДТСААФ і аргкамітэтаў на факультэтах па выкананню умоу агляду-конкурсу. Вынікі агляду-конкурсу падводзіліся у сакавіку і маі.

У сакавіку адбыуся сход камсамольскага актыву ДТСААФ, на якім абмяркоувалiся пытанні абаронна-масавай работы ў святле рашэнняу ЦК КПСС аб святкаванні 30-годдзя Перамогі. Акрамя гэтага, партком універсітэта правеу нараду з прадстаунікамі усіх грамадскіх арганізацый па планаванню работы па ваенна-патрыятычнаму выхаванню.

У мінулым навучальным годзе адбылiся 43 тэматычныя вечары, 252 сустрэчы з героямі і ветэранамі, 928 лекцый і гутарак і многа іншых цікавых мерапрыемстваў.

Гэта значна ажывіла работу абаронных гурткоу, палепшыла спартыуна - масавую работу па ваенна-прыкладных відах спорту.

Ва універсітэце працавалі гурткі па падрыхтоуцы шафёрау-аматарау, радыётэлеграфістаў, парашутыстаў і стралковы гурток.

У мінулым навучальным годзе адбылiся спаборніцтвы па ваенна-прыкладных відах спорту, у якіх удзельнічалі 5.350 чалавек; падрыхтавана 346 спартсменау-разраднікаў. 1.770 чалавек выканалі нормы ГПА па кулявой стральбе.

Лепшымі па абаронна-масавай рабоце у ходзе агляду-конкурсу прызнаны: біяфак, хімфак, фізфак, механіка-матэматычны факультэт; па ваенна-патрыятычнаму выхаванню — гістфак; па наглядная агітацыі—фізфак і геафак.

Цяпер арганізацыі ДТСААФ універсітэта разгарнулі работу па дастойнай сустрэчы XXV з'езда КПСС. Прыняты сацыялістычныя абавязацельствы, арганізуюцца новыя гурткі, праводзяцца іншыя мерапрыемствы.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ПАЛІТЭКАНОМАЎ

Пры універсітэце адбылася навукова-метадычная канферэнцыя выкладчыкаў палітэканоміі вышэйшых навучальных устаноу рэспублікі. На ёй абмяркоуваліся метадалагічныя пытанні удасканалення выкладання палітычнай эканоміі. Праграма канферэнцыі прыцягнула увагу не толькі палітэканомаў рэспублікі, але і многіх буйных навуковых цэнтраў краіны. У яе рабоце актыуны удзел прынялі вучоныя Масквы, Ленінграда, Свярдлоуска, Украіны і Прыбалтыкі.

На пленарным пасяджэнні і на лекцыях было заслухана каля 20 дакладау і больш як 30 паведамленняу. Асаблівую увагу і цікавасць выклікалі выступленні прафесараў маскоускіх навучальных устаноу Р. Т. Рамanава, М. А. Цыголава, М. С. Атлос, М. М. Азаравай. Іх даклады былі прысвечаны актуальным метадалагічным праблемам палітычнай эканомii як навукі і вучэбнай дысцыпліны.

Актыуны удзел у рабоце канферэнцыі прынялі эканамісты універсітэта. Так, загадчык кафедры палітычнай эканомii гуманітарных факультэтаў У. К. Драчоу зрабіу даволі змястоўны даклад на тэму «Асноўныя кірункі навукова - метадалагічных даследаванняу па палітычнай эканомii». Дацэнт А. Г. Сімашчанка прысвяціу сваё выступленне праблеме высвятлення ідэалагічных функцый курса палітычнай эканомii капіталізму. Дацэнт Л. М. Ільюцік гаварыу у сваім дакладзе аб галоуных функцыях палітычнай эканомii у развітым сацыялістычным грамадстве. На цікавым тэарэтычным матэрыяле пабудаваў свой даклад прафесар І. Д. Прахарэнка. Ён быу прысвечаны эканамічным аспектам сацыялістычнага ладу жыцця у курсе палітычнай эканомii сацыялізму. Прафесар І. В. Васін прысвяціу сваё выступленне пытанням высвятлення агрэсіунага характару імперыялізму у курсе палітычнай эканомii капіталізму. Нарэшце, дацэнт А. А. Кузьмічоу, які выступіу з паведамленнем, гаварыу аб удасканаленні методыкі выкладання асноунага эканамічнага закона сацыялізму.

Работа канферэнцыі працягвалася два дні. Другі дзень работы быу прысвечаны абмеркаванню многіх праблем метадалогii палітычнай эканомii на трох секцыях, якія узначальваліся дацэнтамі М. І. Базылевым і С. Я. Янчанкам, прафесарам І. Д. Прахарэнкам.

У рабоце канферэнцыі прынялі удзел намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Ф. М. Капуцкі і рэктар універсітэта, член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР прафесар У. М. Сікорскі.

Вынікі работы канферэнцыі падведзены на заключным пленарным пасяджэнні.

Глыбокае абмеркаванне пастаулена праблемы дазволіла выпрацаваць канкрэтныя рэкамендацыі па удасканаленню навукова-метадычнай работы выкладчыкаў і кафедр палітычнай эканомii. Яны накіраваны у аддзел грамадскіх навук Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

Ул. КУЛАЖАНКА,
дацэнт, грамадскі карэспандэнт часопіса «Эканамічныя навукі».



ТВАЯ НАСЦЕННАЯ...

ВЯЛІКАЯ увага удзяляецца насценнаму друку на фізічным факультэце універсітэта. Насценная газета для фізікаў — гэта сродак інфармацыі, які дапамагае знаёміцца з усім тым, што вакол нас: з дасягненнямі і поспехамі таварышаў па факультэту, з камсамольскімі справамі. І каб газета была цікавай для кожнага, рэдкалегія працуе ад усёй душы, з захапленнем.

— Вельмі прыемна, калі пасля доўгай і напружанай працы над чарговым нумарам бачыш, як каля газеты спыніліся студэнты, выкладчыкі, уважліва чытаюць яе. Значыць, старанне было не дарэмным,—гаворыць Галіна Барысава, былая адказная за сектар друку факультэта. — Паяўляецца натхненне працаваць яшчэ лепш, рабіць газету яшчэ цікавейшай і прыгажэйшай.

Калі я убачыла першы сёлетні нумар газеты фізфака «За навуку», адразу кінулася у вочы яе цікавае афармленне, захацелася прачытаць, аб чым жа і як пішуць фізікі. Шчыра кажучы, я была у захапленні ад мовы, якой напісаны артыкулы. Гэта яскравая, прыгожая руская мова.

Калі я папрасіла Галіну Барысаву расказаць аб рэдкалегіі, дзяўчына адказала: «Ведаеце, аб гэтым зараз гаварыць цяжка. Справа у тым, што частка рэдкалегіі змянілася, ды і часу яшчэ прайшло мала, каб

«ПРАЦАВАЦЬ ГЭТАК ЖА ПАЁННА...»

убачыць, як яна працуе. Мне вельмі хацелася б адзначыць работу былога саставу рэдкалегіі».

У рэдкалегію уваходзіла 11 чалавек. Сярод іх студэнты усіх курсаў з I па IV, а таксама выкладчыкі і супрацоўнікі факультэта. У рэдкалегіі абавязкова ёсць тры так званыя журналісты (гэта, звычайна, першакурснікі, якія у асноўным забяспечваюць газету неабходнымі матэрыяламі) і два мастакі. Калектыву працаваў зладжана, з патхненнем. Газета выходзіла штомесячна і абавязкова да кожнага свята. Пасля выпуску газеты адразу збіраліся і абмяркоувалі наступны нумар.

Як вядома, у мінулым годзе насценная газета фізічнага факультэта «За навуку» заняла першае месца сярод насценных газет факультэтаў універсітэта.

— У гэтым немалая заслуга, — адзначае Г. Барысава, — нашых старэйшых таварышаў М. М. Шумейкі і М. В. Бортніка, якія укладвалі у кожны нумар шмат намаганняў, заусёды прыходзілі на дапамогу нам, студэнтам.

Вялікая заслуга у поспехах рэдкалегіі і Галіны Барысавай, якая два гады узначальвала сектар друку факультэта. Зараз Галіна на пятым курсе, таму месца сваё уступіла малодшым: Таццяне Кудзінай і Ірыне Савачкінай, студэнткам другога курса. За выдатную работу у рэдкалегіі Галіна Барысава узнагароджана Ганаровай граматай камітэта камсамола.

У газеце фізфака прыцягвае увагу тэматыка і разнастайнасць рубрык. Вучоба, адпачынак, камсамольскія справы, цікавыя паходы, абарона дысертацый — вось некаторыя тэмы, якія знаходзяць тут асвятленне. А хіба застанешся абыякавым да матэрыялаў, змешчаных пад рубрыкай «Мы у гасцях»! Гэта рубрыка заусёды паяўляецца у восеньскіх нумарах газеты, прысвечана яна летнім падарожжам студэнтаў за мяжу у брацкія сацыялістычныя краіны.

Кожная кафедра і паток факультэта маюць сваю асабістую насценную газету. У мінулым годзе паміж кафедральнымі насценгазетамі быў праведзены конкурс, прысвечаны 30-годдзю Перамогі. Першае месца заняла газета кафедры электрафізікі, рэдактарам якой з'яўляецца Ала Баркова.

— Хочацца пажадаць рэдкалегіі, — гаворыць Галіна Барысава, — працаваць гэтак жа плённа, як і у мінулыя гады. І абавязкова утрымаць у сваіх руках першае месца. Я думаю, што так і будзе.

Л. ВАРАНКО,
студэнтка II курса журфака.

ШЧАСЛІВАГА ПАДАРОЖЖА ПА КРАІНЕ ГЕАФАКІІ!

Шум, смех, жарты, вясёлыя і трошкі усхваляваныя твары першакурснікаў геафака: сёння яны віноўнікі урачыстасці. Пасвячэнне у студэнты... Дзень, які застанецца у памяці кожнага на доўгія-доўгія гады. Цёплымі словамі віталі студэнтаў выкладчыкі факультэта. Уважліва, з вялікай цікавасцю слухалі першакурснікі расказ сваіх старэйшых сяброў пра захапляючыя паходы і экспедыцыі, пра нялёгкую, але цікавую работу географа.

На урачыстае пасвячэнне у студэнты завітала і сама каралева Заліковая Кніжка разам з Вярхоўным Жрацом краіны Геафакіі. З жартамі і вясёлым студэнцкім смехам пачауся Урок Славеснасці.

— Дуб, — чытае Вярхоўны Жрэц, і каралева Заліковая Кніжка расшыфроувае гэтае паняцце: «Студэнт з моцным здароуем».

— Падказка — перадача думак на адлегласці.

Зала адгукаецца дружным смехам. Студэнты — народ вясёлы і заусёды з пачуццём гумару. Але вось Урок Славеснасці скончаны. Надыходзіць урачыстая хвілина: зараз кожны першакурснік дасць абяцанне з гонарам несці высокае званне студэнта ВДУ, захоуваць вернасць факультэту.

— Клянёмся! — гучыць у зале.

Пасля прыняцця прысягі уся зала спявае гімн краіны Геафакіі. Яшчэ раз першакурснікам жадаюць шчаслівага плавання па хвалях якіяна ведау. А потым студэнты старэйшых курсаў паказалі імянінніцам канцэрт. А тыя гарачымі апладысментамі суправаджалі выступленні сваіх новых сяброу. Асабіста спадабалися усім нумары з удзелам І. Ляпёшкінай, Г. Русак, А. Пярцова, В. Мяшчэрскай, В. Быкавай і іншых. Гэты урачысты вечар — пасвячэнне у студэнты — застанецца у памяці студэнтау надоуга.

Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.

ЗАКРУЦІЦЦА ДЫМ КАЛЯ ПАЛАТКІ

Нікога ужо не здзіуляе паяуленне на вуліцах Мінска юнакоу і дзяучат у спартыунай форме — члены спортклуба «Буравесьнік». праводзяць чарговую трэніроуку. Ні дождж, ні вецер не спыняе маладых, таму што яны — альпіністы, а горы прызнаюць толькі смелых, дужых, лоукіх.

Не так даўно ва універсітэцкі клуб турыстау-альпіністау прыйшлі навічкі, студэнты першых-другіх курсау. Уважліва слухалі яны расказы ветэранау клуба М. Яуменчыкава, Р. Стэльмаха, В. Шуклінай, якія успаміналі паходы, горныя вяршыні, цяжкія пад'ёмы...

І вось першае выпрабаванне. 25—26 кастрычніка у раёне піянерлагера «Лясная казка» праходзіу традыцыйны восеньскі злёт турыстау - альпіністау. Няма сумнення, што гэтыя шчаслівыя дні надоуга застануцца у памяці рабят. Як цікава праходзіла начное арыентаванне! Суддзі былі строгія, але гэта не перашкаджала ім падбадзёрваць удзельнікаў жартамі, частаваць смачнымі бліна-мі. А колькі выдумкі, фантазіі праявілі рабяты у канцэрце мастацкай самадзейнасці. Дастаткова успомніць вясёлыя частушкі, цыркавыя нумары, танец з -ледасекамі, нават танец маленькіх лебедзяу.

А назаутра ва урачыстай абстаноуцы адкрыуся парад удзельнікаў злёту. Пераможцы начнога арыентавання падняліся сцяг. І зноу — спаборніцтвы. Якія толькі. каверзы не чакалі спартсменау на трасе па пераадольванню перашкод! Рабяты паказвалі цуды смеласці і лоукасці, але некаторым усё ж такі давялося выкупацца у рэчцы.

У душы кожнага і цяпер гучаць звон гітар, добрыя песні пра сінія горы, пра скалы з вечнымі снягамі, пакораныя і непакораныя вяршыні, пра надзейнага сябра...

Рабяты не заспакойваюцца. Такая ужо душа у альпініста, цягне у дарогу. У час Кастрычніцкіх свят намячаецца паход, а пакуль што ідуць трэніроукі. Але хутка, вельмі хутка шукальнікі неспакойнага шчасця зноу пойдуць туды, дзе цяжка, за пахам лесу, за туманам, за далёкімі зоркамі...

І. ЖУК,
студэнтка I курса журфака.

НА ВАШУ КНІЖНУЮ ПАЛІЦУ

У выдавецтве БДУ у 3-м квартале 1975 года выйшлі з друку наступныя кнігі:

М. І. Базылеу. Станаулення эканамічнай тэорыі сацыялізму у СССР. На руск. мове, 9,47 арк., тыраж 4800 экз., цана 96 кап.

У рабоце разглядаюцца метадалагічныя праблемы станаулення і развіцця эканамічнай тэорыі сацыялізму у СССР у пераходны перыяд, аналізуецца значэнне укладу У. І. Леніна у распрацоуку карэнных праблем будаунiцтва сацыялізму. Значная увага ўдзелена крытыцы антыленінскіх эканамічных тэорый, адмауляушых неабходнасць стварэння палітычнай эканоміі сацыялізму як навукі. Пытанні тэорыі сацыялізму звязваюцца з практыкай сацыялістычнага будаунiцтва у БССР.

Разлічана на выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін, студэнтаў, супрацоунікаў НДІ, партыйна-гаспадарчы актыу, слухачоу семінараў па павышэнню палітычных і эканамічных ведау, а таксама на шырокае кола чытачоу, якія цікавяцца ленінскай тэарэтычнай спадчынай і праблемамі станаулення эканамічнай тэорыі сацыялізму.

Н. А. Міхайлідыс. Ідэалогія і палітыка антыкамунізму у Лацінскай Амерыцы. На руск. мове, 11,41 арк., тыраж 2350 экз., цана 1 руб. 14 кап.

Калектыу аутараў. Пытанні гісторыі КПСС. На руск. мове, 13,42 арк., тыраж 930 экз., цана 1 руб. 35 кап.

Калектыу аутараў. З гісторыі германскага рабочага руху і савецка-германскай інтэрнацыянальнай садружнасці. На руск. і нямецкай мовах, 12,04 арк., тыраж 1000 экз., цана 1 руб. 20 кап.

Н. С. Адзярыха. Лекцыі па тэорыі пераносу праменнай энергіі. На руск. мове, 10,19 арк., тыраж 2500 экз., цана 37 кап.

Калектыу аутараў. Асновы навуковага атэізму. На руск. мове, 12,29 арк., тыраж 42000 экз., цана 40 кап.

П. А. Дубавец. Прававыя меры барацьбы супраць п'янства і алкагалізму. На руск. мове, 5,22 арк., тыраж 56000 экз., цана 16 кап.

М. М. Гапановіч. Апазнаванне у судавытворчасці. На руск. мове, 9,79 арк., тыраж 7000 экз., цана 63 кап.

У рабоце разглядаюцца працэсуальны і псіхалагічны аспекты праблемы апазнавання у судавытворчасці, у гэтым плане аналізуюцца заканадаўства, судова-следчая практыка.

Работа можа быць выкарыстана як вучэбны дапаможнік пры вывучэнні данай тэмы у курсах судовай псіхалогіі, крыміналістыкі, крымінальнага працэсу. Яна будзе карыснай для практычных работнікаў органаў МУС, пракуратуры, суда.

Метады вывучэння лексікі. Пад рэд. А. Я. Супруна. На руск. мове, 13,45 арк., тыраж 2700 экз., цана 1 руб. 36 кап.

М. А. Кушын. Заходняя Еуропа: касмічная тэхніка і эканоміка. На руск. мове, 9,18 арк., тыраж 1800 экз., цана 93 кап.

У кнізе даецца палітыка-эканамічны аналіз адной з навейшых галін капіталістычнай эканомікі — вытворчасці касмічнай тэхнікі у краінах Заходняй Еуропы. Аутар разглядае нацыянальныя касмічныя праграмы ФРГ, Англіі, Францыі, Італіі і некаторых іншых краін, аналізуе рэнтабельнасць вытворчасці і выкарыстання касмічнай тэхнікі, падрабязна характарызуе структуру дзяржауна-манапалістычнага комплексу, узнікшага у авіякасмічнай прамысловасці гэтых краін, на прыкладзе данай галіны раскрывае унутраныя спружыны міжнароднай капіталістычнай інтэграцыі і міжімперыялістычных супярэчнасцей.

Разлічана на навуковых супрацоунікаў, выкладчыкаў, прапагандыстаў.

М. В. Мяцельскі. Дыдактыка матэматыкі. На руск. мове, 13,58 арк., тыраж 12250 экз., цана 50 кап.

Т. Ф. Каванава, Н. Т. Сікорская. Дапаможнік па англійскай мове. Выд. 2-е, перапрац. На англ. мове, 16,19 арк., тыраж 100.000 экз., цана 58 кап.

А. А. Віхрау. Баявы памочнік КПЗБ (1921—1928 гг.). На белар. мове, 7,08 арк., тыраж 2550 экз., цана 71 кап.

Работа прысвечана дзейнасці Камуністычнага Саюза Моладзі Заходняй Беларусі у 1921—1928 гг. На аснове дакументальнага матэрыялу, большая частка якога упершыню уводзіцца у навуковы абарот, асвятляюцца сацыяльна-палітычныя перадумовы рэвалюцыйна-вызваленчага руху моладзі Заходняй Беларусі, раскрываецца працэс стварэння камсамольскіх арганізацый і іх роля у рэвалюцыйна-вызваленчай барацьбе; аналізуюцца метады партыйнага кіравання камсамолам.

Разлічана на прапагандыстаў, студэнтаў, партыйна-камсамольскі актыу.

Г. Б. Ватковіч. КПЗБ у барацьбе за інтэрнацыянальнае адзінства працоуных (1929 — 1933 гг.). На руск. мове, 7,18 арк., тыраж 3000 экз., цана 73 кап.

А. ЗЯНКЕВІЧ.

ЛІСТАПАД

2 лістапада—80 год назад, восенню 1895 года, у Пецярбурзе па ініцыятыве У. І. Леніна быў створаны «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа».

3 лістапада—80 год з дня нараджэння Э. Г. Багрыцкага (Дзюбіна) (1895—1934), савецкага паэта.

7 лістапада—58 год Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

10 лістапада—30 год з дня стварэння (1945) Сусветнай федэрацыі дэмакратычнай моладзі.

10 лістапада—Дзень савецкай міліцыі.

10 лістапада—Сусветны Дзень моладзі.

17 лістапада — Міжнародны Дзень студэнтаў.

19 лістапада—100 год з дня нараджэння М. І. Калініна (1875—1946), дзеяча Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы.

19 лістапада—Дзень ракетных войск і артылерыі.

23 лістапада—100 год з дня нараджэння А. В. Луначарскага (1875—1933), савецкага дзяржаунага і партыйнага дзеяча, літаратара.

28 лістапада—60 год з дня нараджэння (1915) К. М. Сіманава, савецкага пісьменніка.

28 лістапада—155 год з дня нараджэння (1820) Фрыдрыха Энгельса.

29 лістапада—30 год назад (1945) была абвешчана Федэратыуная Народная Рэспубліка Югаславія (цяпер СФРЮ). Нацыянальнае свята Югаславіі.

29 лістапада—55 год з дня устанаулення (1920) Савецкай улады у Арменіі.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

В. ЗАДАЛЯ

У палон жыццё імкліва
узяло
І закружыла, як на каруселі:
Мільгане то снежнае крыло
У нябыт сышоушае мяцелі,
То слепіць восень золатам
агней
І ліст пажоуклы кіне
на далоні,
Нібыта пропуск прапануе
мне
У год наступны, што шпаком
гамоніць.

Студэнт II курса факультэта журналістыкі Васіль Рошчын піша вершы дауно. А у нашай газеце друкуецца упершыню. Замест візітнай карткі—вершы...



В. ЗАДАЛЯ

Годы, не навещайте домик отца,
Лучше садами зелёными ходите,
Последнюю ступеньку крыльца
В землю втаптывать погодите.

В брёвнах стен трещин не множьте:
Осень трещины заливает водой,—
Сыро... Годы, пожалуйста, если
можете,
Обойдите домик отца бедой.

Столько знать, столько видеть —
Ни строки, как шпагат.
Гуси, как вы летите
Вдоль рябиновых хат!
Крик земли, что рожает
В этом месте, где рожь,
Кто услышит, снижает
Свой полёт, словно ложь.
А глубины в глубинах —
Голубей, что ли, взлёт?
Мы из той половины,
Что всей жизнью поёт.
Это счастье, что, если
И приходит конец,
Скажет стая: «Воскресни,
Не мудрец, а отец!»
Снова бьёт осень клинья
Журавлей в небосвод.
Лошадь к свежей полынье
Прискакала и пьёт.

ФОТААКНО ПАДАРОЖНІКА



ПА-ЭВЕНСКУ ЕНІСЕЙ — ІОАНЕСІ — ВЯЛІКАЯ РАКА. А ЯНА І САПРАЎДЫ БЯСКРАЙНЯЯ, ВЕЛІЧНАЯ. У РЭЧЫШЧЫ — КАМЯНІСТЫЯ ПЕРАКАТЫ І ПАРОГІ. НЯСЕ ІМКЛІВЫ ЕНІСЕЙ СВАЕ ВОДЫ ДА САМАГА КАРСКАГА МОРА. Фота Э. ІШУЦІНА.

Трэці год запар я рыхтаваўся трымаць уступныя экзамены. І вось прыёмная камісія. Знаёмая працэдура здачы дакументаў — і ты абітурыент.

Я крочыу па вулицы у напрамку аутавакзала, дзе пакінуу у камеры захоування багажу чамадан з кнігамі і вопраткай. Накіраванне у інтэрнат ляжала у кішэні. Хацелася хутчэй уладкавацца, адпачыць з дарогі. На вакзале — сапраўднае стоупатварэнне. Людзі мітусіліся, спяшаліся. Цікава было б паглядзець зверху на гэты устрывожаны чалавечы мурашнік.

Людскі вір падхапіу мяне, панёс, нібы шчэпку па вадзе, выкінуу на перон прыбыцця.

З падышоушага аутобуса пасыпаліся пасажыры. Не паспеу я саступіць у бок, як нешта цяжкое і вострае стукнула па назе.

— Прабачце, калі ласка, я не наумысна.

На мяне спалохана пазірала дзяучына у блакітным жакеціку з двума вялікімі чамаданамі у руках.

— Можна і прабачыць,— згадзіуся я. — Асцярожней трэба, а то гэтымі прасамі і ногі перабіць можна.

— Там няма ніякіх прасаў, там кнігі, — дзяучына паціснула плячыма і адвярнулася.

— А я што кажу: хіба кнігамі чалавека адправіць на той свет праблема?

Незнаёмая зірнула колючым поглядам: чаго, маўляу, прычапіуся, ідзі сваёй дарогай.

І я пайшоу далей.

Забраць чамадан мне не удалося. У камеры захоування было многа людзей, якія утварыли даужэзную чаргу. Па маіх падліках стаяць прыйшлося б гадзіны з дзве, калі не больш. Я рашуча пачау пракладваць шлях назад.

Марнаваць дарэмна час не хацелася. А чамадан можна забраць і увечары, калі натоуп знікне і чакаць доуга не прыидзецца. Зараз галоўнае — уладкавацца у інтэрнат.

Дзяучына, што не пажадала са мною размауляць, была на тым жа месцы, дзе я пакінуу яе. Яна сядзела на чамадане і разгублена азіралася.

— Ну што, чамадан з кнігамі, кукуеш?

— Не кукую, а чакаю насільшчыка.

— Ну-ну, чакан, мо і дачакаешся да раніцы.

— І дачакаюся!

— Паспрабуй.

— Паспрабую...

— Спадзявайся.

— Будзь.

Я адышоуся на некалькі крокаў, азірнууся. Дзяучына дапытліва пазірала мне услед.

— Паслухай, табе куды трэба, магу дапамагчы, — вырашыу я прапанаваць свае паслугі.

— Сапрауды дапаможаш?

— У цырк паступаць не збіраюся, жарты не жартую... Куды цягнуць твае прасы?

— Кнігі!..

— Але, яны самыя.

— Я прыехала паступаць вучыцца.

— Гэта дастойна паваги. І які ж «каледж» вырашыла ашчаслівіць?

— Не каледж, а універсітэт, між іншым, — з гонарам паправіла мяне спадарожніца.

— Нават так, — усміхнууся я. — У такім выпадку пакінуць сябра-абітурыента у бядзе у мяне не хопіць сумлення.

— Што, і яно ёсць у наяунасці?

В. ЗАДАЛЯ

АКЦЯБРЫНА

АПАВЯДАННЕ

— Раніам было... Пайшлі!

Пакуль дайшлі да універсітэта, рукі мае, здавалася, вось-вось адваляцца. Чорт бы узяу гэтае бойкае дзяучо з яе «прасамі»!

— Прынішлі быцам, —я паставіу чамаданы. — Якія будуць далейшыя загады, капітан?

— Адпачні крыху тут, а я тым часам забягу у прыёмную камісію, даведаюся наконт інтэрната.

Вялікі гадзіннік, што вісеу над галавой, паказваў абедзенны перапынак.

— Не спяшайся. Там цяпер амаль нікога няма: перапынак на абед.

— Які перапынак? — не зразумела дзяучына. — Хіба ў прыёмнай камісіі ёсць перапынкі?

— А ты думала!.. Хто ж будзе галодны працаваць? Пачакаеш, і я калісь чакау.

— Дык і ты сюды паступаеш? — шырока расплюшчыла вочы мая спадарожніца.

— А што, не падобны я на абітурыента?

— І так, і не, — шчыра адказала незнаёмая.

— Дарэчы, — прамовіу я, — за гэты час можна было б пазнаёміцца. Мяне завуць Віктарам.

— А мяне—Акцябрынай. Не здзіуляйся, гэтым імем бацькі узнагародзілі мяне у знак таго, што я нарадзілася якраз у Кастрычніцкія святы... Табе можа трэба ісці куды, дык ідзі. Дзякуй за дапамогу.

— Няма за што дзякаваць. А як жа ты далей управішся з гэтым?.. — я кіунуу на чамаданы.

Акцябрына пачырванела.

— А мяне тут дзядзька павінен сустрэць. Нельга ж цябе эксплуатаваць увесь час.

— Калі дзядзька, то яно, канешне, — згадзіуся я. — На якім факультэце шукаць цябе?

— Калі маеш у гэтым патрэбу, то можаш уоачыць мяне на гістарычным.

Мы развіталіся.

Я крочыу люднай вуліцай і думау пра Акцябрыну, папракаў сябе, што так мала даведаўся аб ёй. Адкуль яна? Дзе жыве яе дзядзька? І чаму уладкоуваецца у інтэрнат, калі магла б жыць у таго ж дзядзькі? Вельмі захацелася пабачыць дзяучыну зноу, распытаць яе аб усім. Я ледзь стрымаўся, каб не вярнуцца назад. А ўвогуле, сустрэнемся неузабаве, у адзін жа універсітэт паступаем.

Але сустрэцца доуга не даводзілася. Пачаліся экзамены, кансультацыі. Часу не было паесці як след, а не тое, каб шукаць кагосьці.

(Заканчэнне будзе).

КАХАННЕ

НАВЭЛА

Цямнела цяпер хутка. Дзьмуу пранізлівы вецер. Ён злосна зрываў апошняе бурае лісце з галінак дрэу, бесцырымонна развяваў палто і плашчы прахожых, якія, уткнуушы насы ў кауняры, спяшаліся дамоу.

А вецер, бы звар'яцеушы, схапіу кучу лісця і шпульнуу пад ногі тым, дваім, што ішлі поруч і нічога не зауважалі навокал.

Дзяучына, звонка засмяяўшыся, адштурхнула прыліпшае лісце, а юнак толькі цяпер зауважыу, што пачынаецца дождж. Схіліўшыся адзін да аднаго, пад парасонам, яны зноу захапіліся размовай, забыўшыся на непагадзь.

Хлапец усё нешта імкнууся сказаць:

— Ты ведаеш, я...

Але тут моцны парыу ветру вырваў з яго рук парасон і панёс уздоўж тратуара. Хлапец кінууся за ім, а услед яму зазвінеу нястрымны дзявочы смех...

А тым часам хмара абляпіла усё неба, і дождж разышоуся не на жарт. Прахожых ужо амаль не было. Толькі рэдкая машына прашмыгне, распырскваючы веерам лужыны, ды мацней забубніць па дахах дождж...

— Ой, я ўжо замерзла, — нарэшце, схамянулася дзяучына.

— То пайшлі, схаваемся, — і яны хутка забеглі у пад'езд.

— Якія ж яны у цябе халодныя, — са стрыманай ласкай у голасе прамовіу юнак, узяушы у свае шырокія далоні тонкія дзявочыя пальцы. Схіліушыся, ён пачаў грэць іх сваім дыханнем.

Дзяучына стаяла, не рухаючыся. Сэрца яе залівала цёплая хваля пяшчоты. Гэта хваля дакацілася і да яе шчок: яны успыхнулі гарачым румянцам. Цёмныя, як гэта восеньская ноч, вочы яе заблішчэлі ад стрыманага пачуцця. Вусны уздрыгвалі: здавалася, з іх вось-вось сарвецца нейкае слова...

Але не. Дзявочая сарамлівасць перашкаджала ёй. Яна толькі лёгкім, амаль непрыкметным рухам правяла па валасах юнака:

— Які ж ты ускудлачаны...

Крануты нечаканай ласкай сваёй смяшлівай сяброукі, той, нарэшце, асмеліуся:

— Я кахаю цябе, чуеш? — гулка пабегла па пустому пад'езду.

— Цішэй, людзей напалохаеш! — спрабавала сцішыць яго дзяучына, адчуваючы, як сэрца яе закалацілася моцна-моцна...

— А ты, ты?! — усхвалявана і трывожна чакаў адказу юнак. Тады яна моучкі узняла на яго пацямнеушыя ураз вочы. І, зазірнуушы у іх, ён засмяяуся ад шчасця: такой пяшчотай, такой ласкавасцю ззялі яны...

Раптам ім з іх неабдымным, на увесь зямны шар, шчырым і чыстым каханнем стала цесна у пад'ездзе. Схапіушыся за рукі, яны выбеглі на вуліцу, пераскочылі праз лужыну, паглядзелі адзін на аднаго, засмяяліся і ужо далей пайшлі цішэй, трымаючыся за рукі.

Дождж ужо амаль супакоіуся. Толькі вецер яшчэ доуга рваў на кавалачкі хмару і гнаў гэтыя кавалачкі невядома куды. На далёкім цёмным небе запаліліся зіхатлівыя зоркі. Вуліцы ужо дауно апусцелі. Вулицы спалі... Не было чутно нават далёкага гулу машын.

Ліхтары моучкі паглядалі у лужыны на свае зяючае адлюстраванне. А цікаўныя зоркі, выглядваючы з-за хмары, таксама хацелі убачыць тое, што бачылі начныя ліхтары.

Бо толькі яны, гэтыя ліхтары, былі сведкамі таго, як па пустой вуліцы, моцна узяушыся за рукі, ішлі двое...

Т. ВОЛКАВА,
студэнтка I курса журфака.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Рэдактар
Аб'ём—1,5 друк. ар. АТ 06819 Заказ. № 1644. А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.